ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
21 ВЕРАСНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15962)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Элеанора КАЧАЛОЎСКАЯ:

# «Быць прыгожай — гэта ў першую чаргу быць сапраўднай»



**Светлавалосая, блакітнавокая, добрая і шчырая — менавіта такая дзяўчына па-сапраўднаму ўвасабляе прыгажосць нашай краіны. Сёлета за тытул «Міс Беларусь» у фінале XIII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці змагаліся дваццаць чатыры дзяўчыны з рэгіёнаў і сталіцы. Пераможцай стала мінчанка Элеанора Качалоўская, якая расказала нам аб падрыхтоўцы да конкурсу, сваім хваляванні ў дзень фіналу і адказнасці, якая прыйшла да яе разам з каронай.**

**Элеаноры дваццаць тры гады. Яна ўжо скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а цяпер навучаецца на псіхолага ў педагагічным універсітэце. Паралельна працуе менеджарам мадэльнага агенцтва ў Нацыянальнай школе прыгажосці. А вось у Мінск пераехала некалькі гадоў таму з Гомеля, дзе і пачалася яе кар'ера ў сферы прыгажосці.**

— Упершыню ў свет мадэлінгу я трапіла, калі была яшчэ зусім дзіцем. Мне было гадоў пяць-шэсць, і мы з мамай пайшлі да цырульніка цёткі Олі, якая на той момант працавала з мадэлямі. Тады яна параіла мне прыняць удзел у конкурсе прыгажосці «Маленькая гамяльчанка», але на той момант мне гэта было зусім не цікава. Я ўвогуле ў дзяцінстве хацела стаць прадаўцом рыбы. Мы з мамай часта хадзілі на рынак, і мне вельмі падабалася адна прадаўшчыца сваёй энергіяй. *(Смяецца.)* Праз нейкі час я пачала наведваць мадэльную школу ў Гомелі і ўжо праз два гады ўсё ж прыняла ўдзел у гэтым конкурсе і перамагла. Пасля гэтага мяне запрасілі супрацоўнічаць з фабрыкай «8 Сакавіка» і кампаніяй «Світанак».

Яшчэ праз два гады юная Элеанора выйграла конкурс «Little Miss and Mister World 2012», які праходзіў у Турцыі. Як пісалі тады СМІ, маленькая красуня пакарыла журы не толькі дэфіле, але і вершам Караткевіча пад мелодыю «Белавежскай пушчы». І ў гэты ж час атрымала свой першы кантракт на работу ў Мілане. Але, нягледзячы на значныя поспехі ў свеце мадэлінгу, у шаснаццаць гадоў дзяўчына ўзяла паўзу і ўсю сябе прысвяціла падрыхтоўцы да паступлення ва ўніверсітэт.

— У маім жыцці вельмі часта ўсё адбываецца выпадкова. Я не планавала вяртацца ў гэтую дзейнасць. Аднак, будучы яшчэ студэнткай, стала працаваць у Нацыянальнай школе прыгажосці ў Мінску, дзе пасля пачала праходзіць адпрацоўку пасля заканчэння вучобы. Ужо падчас працы я воляй лёсу пазнаёмілася з фатографам і, дзякуючы «сарафаннаму радыё», атрымала кантракт на работу ў Турцыі мадэллю. Так адбылося і з конкурсам. Усё па волі лёсу. Проста аднойчы, выйшаўшы са спартзалы, наўпрост трапіла на кастынг «Міс Беларусь».

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Крок да прафесіі

## ПА ДОБРЫ ДОСВЕД ПРАЦЫ — НА ЧЫГУНКУ

**Студэнцкі рух на Беларускай чыгунцы з кожным годам актыўна развіваецца. Калі летась у арганізацыях магістралі працавалі каля 230 студэнтаў і навучэнцаў, то сёлета — у 2,5 раза болей.**

У ліпені-верасні яны шчыравалі праваднікамі пасажырскіх вагонаў і манцёрамі пуці, цеслярамі і малярамі, выхавацелямі і інструктарамі ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Пашырылася і геаграфія навучальных устаноў краіны. Калі ў 2022 годзе гэта былі байцы студатрадаў з дзесяці вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то сёлета — ужо з больш чым 30, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.

У маі мінулага года Беларускай чыгункай і ГА «БРСМ» было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, накіраванае на развіццё ўзаемадзеяння па пытаннях фарміравання і прыцягнення студэнцкіх атрадаў для работы ў арганізацыях магістралі.

У бягучым годзе пры падтрымцы Цэнтральнага камітэта БРСМ было арганізавана папярэдняе навучанне 200 студэнтаў і навучэнцаў — удзельнікаў чыгуначных сэрвісных і будаўнічых студэнцкіх атрадаў па прафесіях «Праваднік пасажырскага вагона» і «Манцёр пуці».

Падчас сустрэчы кіраўніцтва Беларускай чыгункі з актывам сэрвісных і будаўнічых студэнцкіх атрадаў яго байцы падзяліліся сваімі ўражаннямі аб рабоце на магістралі, а таксама адзначылі высокі ўзровень арганізацыі іх працоўнай дзейнасці, магчымасць атрымаць добры досвед работы, стасункаў і новыя веды.

Кіраўніцтва магістралі падзякавала прадстаўнікам студэнцкіх атрадаў за работу, а таксама выказала надзею, што пасля заканчэння навучальных устаноў многія з іх захочуць прадоўжыць свой працоўны шлях на прадпрыемствах і ў арганізацыях магістралі.

Прадстаўнікі БРСМ, у сваю чаргу, адзначылі важную ролю студатрадаўскага руху ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў краіне і вялікі ўклад Беларускай чыгункі ў яго развіццё.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прафарыенцір

## У трэндзе — выбар рабочай прафесіі



**Калі футуролагі разважаюць пра будучыню, то кажуць, што, выбіраючы прафесію, трэба быць гатовымі выконваць функцыі, якіх сёння яшчэ няма. Але не ўсе прафесіі знікнуць. Паводле прагнозаў, 70—80 працэнтаў існуючых сёння прафесій застануцца, але трансфармуюцца пад уздзеяннем лічбы. Паводле глабальнага даследавання працоўных рэсурсаў, дэфіцыт рабочай сілы ў свеце ў 2030 годзе будзе складаць прыкладна 85 мільёнаў чалавек, але востры недахоп будзе абумоўлены адсутнасцю навыкаў, а не людзей. Галоўная праблема — не адсутнасць рабочых рук, а адсутнасць кваліфікаваных работнікаў.**

**Многія вытворчыя прадпрыемствы выкарыстоўваюць абсталяванне сусветнага ўзроўню, сучасную тэхніку і тэхналогіі. Зыходзячы з гэтага, работадавец чакае тэхнічна падрыхтаваных рабочых, якія змогуць працаваць з інавацыйным абсталяваннем і ўмець яго абслугоўваць. Між іншым, рабочыя прафесіі запатрабаваны не толькі на буйных прамысловых прадпрыемствах, але і ў малым і сярэднім бізнесе. І гэта, як правіла, прадпрыемствы будаўніцтва, гандлю, гасцінічнай сферы, грамадскага харчавання, сельскай гаспадаркі і сферы паслуг. Ці разумеюць гэта выпускнікі, якія часта пад уплывам чужога меркавання імкнуцца атрымаць менавіта вышэйшую адукацыю і пайсці ў сферу разумовай працы?**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*